№№145–146
(3482–3483)
23 верасня 2011 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах
Выдавец: УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

**Да ўвагі!**
*Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!*

www.nv-online.info
# Народная Воля

*На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...*
**Якуб КОЛАС**

НЕЗАВИСИМАЯ ЭКСПЕРТИЗА



*Борис ЖЕЛИБА, профессор, доктор экономических наук*

# Не идет Россия — приходит Китай

После запуска дополнительной сессии на Белорусской валютно-фондовой бирже начался процесс перехода от множественности обменных курсов белорусского рубля к единому. Точнее, к единым его курсам к мировым валютам. Долларовые курсы белорусского рубля, как, впрочем, и можно было ожидать, на первых допсессиях отразили котировки серого (безналичного) и черного (наличного) рынков — свыше 8000 рублей. Таким образом, с первой допсессией был легитимизирован курс, который считался спекулятивным. Поскольку представители Нацбанка заявляли, мол, их официальный курс от 5000 рублей математически просчитан и выверен, они надеются, что биржевые курсы доллара и других валют будут двигаться вниз, к официальным ориентирам. Их оппоненты утверждают, что котировки на первых допсессиях отражают как раз рыночные курсы и что Нацбанку придется подтягивать к ним свои, официальные. Другими словами, как в той восточной поговорке: если Магомет не идет к горе, то гора идет к Магомету.

Оживились обменные пункты валюты. Они выставляют котировки валют, ориентируясь на результаты биржевых торгов. За первые дни работы обменников все же объемы покупки валюты банками превышают ее продажу физическим лицам. Это свидетельствует о том, что непомерная инфляция изрядно опустошила карманы населения. Сотенная долларовая купюра — это больше половины сегодняшней зарплаты белоруса. И не факт, что некоторое подорожание белорусского рубля станет стратегической тенденцией. Слишком много этих рублей было вброшено в обращение за прошедшие месяцы.

Индивидуальные предприниматели считают, что курс доллара свыше 8000 рублей окончательно их добьет. С зарплатой менее 200 долларов по такому курсу покупательная способность населения становится уже никакой. По некоторым стратегическим товарам (бензин, мясо) государственные органы ценообразования продолжают гнуть линию на выравнивание цен на них с российскими. Пересматривая их чуть ли не каждую неделю. В результате мясо уже стало недоступно большинству населения. Забыли подтянуть и зарплату. В пересчете на белорусские рубли по указанному курсу доллара среднемесячная зарплата эстонца составляет 11 млн, поляка — 9 млн, россиянина — 6,5 млн. Больше нашего брата уже зарабатывают украинцы (2,5 млн белорусских рублей), казахи (4,8 млн). Среднемесячная зарплата грузин — 3,7 млн рублей в белорусском эквиваленте. По данным Белстата, средняя зарплата белоруса за июль — 1.854.500 рублей.

И еще. Годовая инфляция в Эстонии составила всего 5,5%. В Беларуси — перевалила за 60%. С начала года цены у нас выросли на 53,6%, в России — на 4,7%, в Украине — на 4,1%, в Казахстане — на 5,9%. Только за август мясо и мясопродукты у нас подорожали на 21,6%, в России — лишь на 0,6%, в Украине — на 3,3%, в Казахстане — на 1,7%. По расчетам специалистов госорганов, в целом за год инфляция может превысить 100%.

Было бы совсем грустно в нашей цветущей зеленым цветом Беларуси, если бы не пришла в который раз помощь с Востока. На этот раз не от России, а от Китая, ставшего для нас еще более дружественным. Итоги визита в Минск китайской парламентской делегации оказались весьма обнадеживающими. Китай пообещал выделить льготный кредит в 1 млрд долларов для реализации совместных проектов и безвозмездную помощь 70 млн юаней. Что примечательно, этот миллиард составят не только так называемые связанные кредиты, когда в счет их поставляются китайские материалы и оборудование, но и, как можно понимать, живая валюта на цели приватизации белорусских предприятий китайскими корпорациями. У России в этом деле появляется реальный и, что немаловажно, близкий по духу руководству Беларуси конкурент. Соответствующее рамочное соглашение подписали министр экономики Беларуси и генеральный директор Китайской национальной машиностроительной корпорации Sinomach. Подписаны рамочное соглашение о Китайско-белорусском индустриальном парке, соглашение между правительствами о технико-экономическом сотрудничестве, рамочное соглашение между правительством Беларуси и “Эксимбанком” Китая и другие документы. Как отмечают аналитики, китайская приватизация в отличие от российской, не несет угрозы независимости Беларуси, поглощения страны. Географически Китай далеко. У него свои цели: через Беларусь ускорить экспансию китайского капитала в Западную Европу и на российский рынок с западного вектора. Словом, не идет Россия, приходит Китай.

Очередное повышение ставки рефинансирования Нацбанком обрадовало вкладчиков. Ставки по рублевым депозитам достигают 45% годовых. Соответственно повысились кредитные проценты. “Белинвестбанк” запрашивает ставку по своему “Экспресс-кредиту” до 75% годовых, “Дельта Банк” начал выдавать кредит “Новый стандарт плюс” с реальной ставкой свыше 80%. Кредитные ставки попросту становятся запретительными для многих потенциальных кредитополучателей.

*(Окончание на 2-й стр.)*

БЛІЦ

# *Дык адбудзецца ў Беларусі «круглы стол» ці не адбудзецца?*

*“Народная Воля “ не раз цытавала А.Лукашэнку, які з розным акцэнтам гаварыў пра “круглы стол”. Але ў апошнія дні гэтае пытанне наогул замоўчваецца.*

*Дык адбудзецца “круглы стол”ці не адбудзецца? Вось меркаванне на гэты конт некаторых прадстаўнікоў улады, апазіцыі і грамадскасці.*

**Жанна ГРЫНЮК, дырэктар Цэнтра сістэмных бізнес-тэхналогій SATIO, сябра грамадска-кансультацыйнага савета пры Адміністрацыі прэзідэнта:**

— Гаварыць пра “круглы стол”, як пра самамэту — няма сэнсу. Сёння трэба ўздымаць пытанне аб уключэнні шырокіх слаёў грамадзянскай супольнасці ў прыняцце рашэнняў. Дарэчы, на бліжэйшым пасяджэнні грамадска-кансультацыйнага савета будзе прадстаўлена распрацоўка, якая і прадугледжвае ўключэнне грамадзянскай супольнасці ў прыняцце рашэнняў. Павінны быць пашыраны каналы зваротнай сувязі паміж уладай (у тым ліку і на мясцовым узроўні) і грамадзянскай супольнасцю.

А калі адказваць на пытанне, ці пройдзе ў Беларусі “круглы стол”, то такое мерапрыемства абавязкова пройдзе, яно будзе падрыхтавана, але я прытрымліваюся стратэгіі сістэмных крокаў, а не нейкіх разавых акцый ці мерапрыемстваў...

**Анатоль ЛЯБЕДЗЬКА, старшыня Аб’яднанай грамадзянскай партыі:**

— Асабіста мне, ад таго калі, дзе і ці пройдзе ці не пройдзе гэты “круглы стол”, ні халодна, ні горача. Таму што “круглы стол” у фармаце ўлады мяне наогул не цікавіць. Падобнае мерапрыемства праходзіла ў 2000 годзе. Там былі прадстаўнікі каля 100 разнастайных арганізацый. І хто сёння ўспомніць, хто там быў, што вырашылася і як змянілася сітуацыя? Хоць адну маленькую, дробненькую праблему вырашыў той “стол”? Акрамя піяру і падману, больш нічога не было. Таму не варта ступаць двойчы ў адно і тое ж, тым больш, калі яно непрыемна пахне... Верагоднасць таго, што піяр-мерапрыемства з назвай “круглы стол” пройдзе, не з-за добрай волі ўлады, а з-за не вельмі добрага сацыяльна-эканамічнага становішча ў краіне. Мерапрыемства пройдзе па сцэнарыі ўлады, з іхнімі ўдзельнікамі і іхнім жа парадкам дня.

**Павел ЛЁГКІ, прэс-сакратар Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь:**

— Чаму вы вырашылі мне патэлефанаваць? Калі ў прэс-службы будзе нейкая інфармацыя на гэты конт, мы пра гэта паведамім і вы пра ўсё даведаецеся...

**Генадзь ФЯДЫНІЧ, старшыня незалежнага прафсаюза работнікаў радыёэлектроннай прамысловасці:**

— Цяжка сказаць, каго меў на ўвазе Аляксандр Лукашэнка, гаворачы пра “нашы і не нашы прафсаюзы”, але нам пакуль ніякага запрашэння прыняць удзел у “круглым стале” не паступала. Ці пойдзем мы туды? Гэта будзе абмяркоўвацца ўнутры нашай арганізацыі.

**Эдуард КАЗУРА, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі:**

— Прэзідэнт жа сказаў, што “круглы стол” пройдзе. Важна, каб у гэтым былі зацікаўлены ўсе патэнцыяльныя ўдзельнікі. Праўда, калі ён пройдзе — мне пакуль невядома.

**Уладзімір НЯКЛЯЕЎ, лідар грамадзянскай кампаніі “Гавары праўду”:**

— Той “круглы стол”, пра які казаў Аляксандр Рыгоравіч, будзе. Які? Ніякі. Можа, і збяруцца прадстаўнікі нейкіх беларускіх арганізацый, расіяне, еўрапейцы... Але мэта “круглага стала”, які арганізоўвае ўлада, будзе толькі адна: пасядзіце, паразважайце, як бы нам грошай зноў знайсці...

Мы ж кажам пра іншы “круглы стол”. Пра той, на якім павінны быць абмеркаваны пытанні, звязаныя з вызваленнем палітвязняў і правядзеннем у першую чаргу сумленных выбараў. Дык вось, сыходзячы з апошніх заяў, такі “круглы стол” праведзены не будзе...

**Апытанне праводзіў Віталь ГАРБУЗАЎ.**

ПАМЯЦЬ



Мінула некалькі дзён пасля развітання з адной з самых цудоўных, самых мужных жанчын Беларусі — дэпутатам Вярхоўнага Савета Беларусі 12-га склікання **Галінай СЯМДЗЯНАВАЙ.**

Балюча, горка ад таго, што рана пакінула яна, актыўная змагарка за незалежнасць Беларусі, зямны свет.

Балюча, горка і ад таго, што ў мінулым нумары “Народнай Волі” быў выпадкова пастаўлены на першай старонцы не той здымак. Не той, які сведчыць, што менавіта Галіна Сямдзянава ўнесла ў Авальную залу парламента наш гістарычны бел-чырвона-белы сцяг, які стаў тады дзяржаўным, а іншы.

Дзеля гістарычнай праўды выпраўляем недарэчнасць і сёння змяшчаем здымак, які павінны былі паставіць у папярэднім нумары. Вось гэты незабыўны момант! Галіна Георгіеўна ўсталявала нашу **Святыню** побач з галоўнай трыбунай і накіравалася на сваё рабочае дэпутацкае месца.

СУД

# «Прашу прыгаварыць Канавалава да расстрэлу»

Бомба, што выбухнула ў мінскім метро, каштавала ўсяго 300 тысяч рублёў. Гэтая лічба была агучана ў Вярхоўным судзе, дзе працягваецца разгляд крымінальнай справы па абвінавачванні Дзмітрыя Канавалава і Уладзіслава Кавалёва ў здзяйсненні шэрагу цяжкіх злачынстваў, у тым ліку выбухах у Мінску на Дзень Незалежнасці 3 ліпеня 2008 года і тэракце ў сталічным метро 11 красавіка 2011 года.

Галоўны абвінавачаны ў судзе пакуль маўчыць. Інфармацыя пра яго дзеянні, намеры, пра ход следства — гэта тое, што Канавалаў гаварыў падчас следства.

Так, у судзе прагучалі сведчанні Дзмітрыя Канавалава аб катаваннях. Па яго словах, адразу пасля затрымання ў памяшканні Упраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю яго катавалі. Па словах Канавалава, двое супрацоўнікаў праваахоўных органаў палажылі яго на жывот, прымусілі скрыжаваць ногі, затым завялі за спіну рукі. Такім чынам яго быццам бы прымушалі прызнацца ў здзяйсненні выбухаў у Віцебску ў 2005 годзе. А вось Канавалаў сцвярджае, што іх не здзяйсняў. Затое не адмаўляе, што выбухі на Дзень Незалежнасці і ў сталічным метро арганізаваў і здзейсніў менавіта ён.

Згодна з яго паказаннямі, якія былі на следстве, 3 ліпеня 2008 года ў Мінску павінны былі выбухнуць два прыстасаванні. Адно знаходзілася ля стэлы, а другое — у раёне гатэля “Планета”. Прычым, па прызнанні хлопца, прыстасаванні на месца ён прыносіў у два заходы — спачатку адно, потым другое. Канавалаў ведаў, што на мерапрыемстве, прысвечаным Дню Незалежнасці, мог знаходзіцца кіраўнік дзяржавы. Але пры выбары месца для яго было важна толькі тое, каб гэта было вялікае скопішча людзей. Прычым, як вынікае з допыту Канавалава, ён прадпрыняў неабходныя меры канспірацыі, каб яго не знайшлі. Напрыклад, прыехаўшы ў Мінск для здзяйснення тэракта 3 ліпеня 2008 года, ён спецыяльна дастаў сім-карту са свайго мабільнага тэлефона.

Мэта здзяйснення тэракта — “дэстабілізацыя сітуацыі ў Рэспубліцы Беларусь”. У той жа час на пытанні следчага, чаму Канавалаў увесь час вымаўляе менавіта гэтую фразу, і што ён пад ёй разумее, адказ быў такі: “Я не буду адказваць на гэтыя пытанні...” Таксама не змог назваць Канавалаў і “найвышэйшую мэту сваёй злачыннай дзейнасці”. Аднак, згодна з іншымі пратаколамі допытаў, “дэстабілізацыя сітуацыі ў Рэспубліцы Беларусь” была патрэбна Канавалаву “для змены ўлады”.

З таго, што прагучала ў судзе, пакуль можна атрымаць наступную інфармацыю. Пасля затрымання Канавалава распачаліся следчыя дзеянні, падчас якіх у падвале аднаго з віцебскіх дамоў было знойдзена месца, дзе хлопец вырабляў выбухоўку — гэта звычайнае збудаванне. Там знайшлі дзённік, у якім былі распісаны спосабы вырабу выбухоўкі. Высветлілася, што хіміяй Дзмітрый Канавалаў стаў захапляцца яшчэ ў восьмым класе, двойчы быў пераможцам школьных алімпіяд. У сваіх паказаннях Канавалаў адзначае, што “жаданне рабіць выбухі ў яго было заўжды, але не заўжды была для гэтага магчымасць”. Праўда, на адным з допытаў ён прызнаўся, што выбух у сталічным метро 11 красавіка бягучага года быў бы апошнім.

Дарэчы, Канавалаў ацаніў для следства і прыкладны кошт выбуховага прыстасавання, якое забрала жыцці 15 чалавек пасля тэракта на “Кастрычніцкай”, — гэта каля 300 тысяч беларускіх рублёў. І столькі гора!

У пратаколе допыту хлопец прызнаецца, што ніякіх пачуццяў да людзей, якія былі ў метро падчас выбуху, у яго не было. Ні жалю, ні нянавісці...

Зараз будуць гаварыць пацярпелыя і іх сваякі. Учора ў судзе распачаліся іх допыты. Сястра загінуўшага 17-гадовага Сяргея Герасімчыка папрасіла прыгаварыць Дзмітрыя Канавалава да расстрэлу, а Уладзіслава Кавалёва — да пажыццёвага зняволення.

**Віталь ГАРБУЗАЎ.**

# Нам хочацца быць разам з Вамі!

***Нагадваем: падпісацца на “Народную Волю” на IV квартал 2011 года Вы можаце ў паштовых аддзяленнях да 27 верасня, а ў спецыялізаваных пунктах “Белсаюздруку” (Мінск) — да 24 верасня. Няма магчымасці падпісацца на 3 месяцы, падпішыцеся на месяц, два, потым прадоўжыце.***

***Нам хочацца быць разам з Вамі!***

УРАЖАННІ

# Гарант незалежнасці — НАРОД!

Пазаўчора ў Мінскім палацы культуры і спорту чыгуначнікаў адбыўся прыём, прысвечаны 20-й гадавіне Незалежнасці Украіны. Ён выклікаў розныя пачуцці. Спачатку пра тое, што парадавала. У выступленні Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Украіны ў Рэспубліцы Беларусь Віктара Ціханава лаканічна і разам з тым даволі выразна былі паказаны як цяжкасці, так і перамогі постсавецкага перыяду развіцця суверэннай дзяржавы. Братняму народу няпроста, але ён жыве без “саўковай” аглядкі на тое, што скажа “старэйшы брат”, спадзяецца на ўласную мудрасць, працавітасць, мае значныя дасягненні. А беларускі бок у асобе першага намесніка міністра замежных спраў здзівіў шчырым прывітаннем на роднай мове, што, пагадзіцеся, бывае не часта.

У праграме прыёму прайшло азнаямленне гасцей з выставай украінскіх таваравытворцаў і працамі майстроў прыкладнога мастацтва. З асаблівай сілай пацвердзілася даўняя думка, што жыццяздольнасць народа найбольш поўна выяўляецца ў мове і мастацтве. Украіна з яе высокай музычнай, песеннай, танцавальнай культурай займае адметнае месца не толькі ў Еўропе, але і ва ўсім свеце. Гэта паказаў святочны канцэрт. Нават у перыферыйных філармоніях Украіны ёсць выдатныя артысты, якія ніколькі не саступаюць сталічным.

Хоць цяпер ва ўсіх краінах свету галоўная ўвага надаецца матэрыяльным пытанням, мушу напомніць, што эканоміку наперад рухаюць толькі адукаваныя, высокакультурныя людзі.

Выдатныя традыцыі развіцця не толькі эканамічных узаемаадносін, але і навуковых, культурных, духоўных стасункаў паміж Украінай і Беларуссю, закладзеныя былым амбасадарам Анатолем Дронем (дарэчы, прафесійным будаўніком!) годна працягвалі Ігар Ліхавы, Раман Бязсмертны. Думаецца, што і надалей навука, культура двух братніх народаў будуць плённа супрацоўнічаць, узаемаўзбагачацца...

На фуршэце, наладжаным пасля ўрачыстай часткі і канцэрта, прагучаў тост за “гарантаў незалежнасці Украіны і Беларусі” — цяперашніх прэзідэнтаў абедзвюх дзяржаў. Рэакцыя публікі аказалася неадназначнай — ад застольнага энтузіязму, звычайнай угодлівасці чыноўнікаў да збянтэжанасці, іранічных усмешак многіх людзей, якія навязлівы заклік праігнаравалі. Усе спробы сёння, калі рушацца дыктатарскія рэжымы ў Паўночнай Афрыцы, на Блізкім Усходзе, калі за свае правы і свабоды выступаюць маніфестанты ў Грэцыі, Іспаніі, Італіі, Францыі, Германіі, калі на вуліцы ўкраінскіх і беларускіх гарадоў пастаянна выходзяць грамадзяне, якія хочуць перамен, вяртацца ў злавесны сталінскі час, раздзімаць з чыноўнікаў любога рангу нейкія культы — задума недарэчная.

Станаўленне грамадзянскай супольнасці ва Украіне і Беларусі адбываецца ў вельмі складаных умовах. Але як бы там ні было, а гарантам незалежнасці любой дзяржавы з’яўляецца нацыянальна свядомы, палітычна адукаваны, разумны, культурны народ. Па вялікім рахунку, усё залежыць толькі ад яго.

**P. S.** Гэты невялічкі рэпартаж складаўся спачатку ў думках, перад “мёртвым” ліфтам, які 22 верасня 2011 года да абеду псаваўся двойчы. У мікраараёне, дзе жыву, не так даўно памянялі старыя, але надзейныя механізмы на магілёўскія, пралабіраваныя нейкім зацікаўленым дзялком. Замена ішла 7 месяцаў, затым паўгода доўжылася наладка, а скончылася тым, што ліфт спыняецца амаль кожны дзень. Таму не зайздрошчу ўкраінцам, якім на ўрачыстасці было паабяцана, што яны атрымаюць прадукцыю сумеснага з “Магілёўліфтмашам” прадпрыемства.

**Сяргей ЗАКОННІКАЎ, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Янкі Купалы, Міжнароднай літаратурнай прэміі Украіны імя Р.Скаварады, кавалер ордэна Украіны “За заслугі” III ступені.**

БЕЛАРУСЬ—ЕВРОПА

## *Майра МОРА: «ЕС не может начать отношений с Беларусью, пока не будут отпущены и реабилитированы все политзаключенные»*

*Первую пресс-конференцию в Минске провела полноценный посол ЕС в Беларуси Майра Мора*

Накануне Мора вручила верительные грамоты Александру Лукашенко в качестве главы представительства.

Дипломат начала общение с журналистами с небольшого уточнения: она напомнила, что является первым полноценным послом ЕС в Беларуси.

*“Надеюсь, что это станет новой главой в наших отношениях. Моя аккредитация пришлась на время очень критического момента в наших отношениях”*, — констатировала Мора.

Естественно, что главной темой пресс-конференции стало развитие отношений Беларусь — Европа. *“Мы надеемся, что они будут отпущены в ближайшее время. Развитие же отношений (после освобождения политзаключенных.* — БелаПАН) *будет зависеть от прогресса Беларуси в сфере демократизации, верховенства законов и соблюдения прав человека, — подчеркнула Мора. — Мы надеемся, что возвращение к нормальному диалогу Беларуси и ЕС может совпасть с обсуждением внутри страны того, как преодолеть сложившуюся ситуацию”.*

По словам Майры Мора, Евросоюз был и остается заинтересованным в сильной и независимой Беларуси. Дипломат призналась, что ЕС возлагает большие надежды на будущие парламентские выборы в Беларуси. “ *Парламентские выборы в следующем году дают новую возможность Беларуси провести выборы в полное соответствие с принятыми международными стандартами и пойти по пути модернизации”*, — заявила дипломат.

Она также отметила: несмотря на сложности в отношениях, Евросоюз полностью не сворачивал сотрудничество с Беларусью. *“Беларусь остается участником “Восточного партнерства”. Мы запланировали ряд технических диалогов, все еще ожидаем ответа на наше предложение о заключении соглашения о реадмиссии. Евросоюз продолжит поддержку гражданского общества и реализацию проектов в сфере энергетики, продовольственной и экологической безопасности, атомной безопасности, а также поддержку СМИ”*, — сказала Мора.

Глава представительства ЕС также отметила: Евросоюзу важно, чтобы транзит энергоносителей через Беларусь работал без перебоя.



ЭШАЛОНЫ ЎЛАДЫ

Рыгор ВАСІЛЕВІЧ:

# «Тыдзень таму я напісаў заяву аб сыходзе...»

*Пра гэта былы Генеральны пракурор Беларусі сказаў "Народнай Волі".*

## Сышоў па ўласным жаданні?

У апошнія як мінімум паўтара года размовы аб адстаўцы Рыгора Васілевіча ўзнікалі прыкладна раз у квартал. Генпракурор і сам перыядычна цікавіўся, каго сватаюць на яго месца. Мяркуючы па апошняй прэс-канферэнцыі, добраахвотна ў адстаўку Рыгор Васілевіч не збіраўся. У яго было шмат планаў і ідэй на будучыню, ён не хаваў, што яму хацелася б завяршыць задуманае.

Варта адзначыць, што мала каму з чыноўнікаў кіраўнік дзяржавы адразу пасля зняцця з пасады (хай нават і з мяккай фармулёўкай *"у сувязі з пераводам на іншую працу"*) казаў столькі добрых слоў...

Некаторыя былыя высокія чыноўнікі праз некаторы час пасля сыходу з улады прызнаваліся: маўляў, перад сыходам не знайшлі часу нават пагаварыць. Рыгор Васілевіч сцвярджае, што быў гатовы пакінуць пасаду генпракурора.

*"Восем дзён таму я напісаў заяву аб сыходзе"*, — пазаўчора сказаў ён "Народнай Волі". Але ад прамога адказу на пытанне наконт таго, па асабістым жаданні ён вырашыў сысці з пасады альбо яму непразрыста намякнулі гэта зрабіць, ухіліўся.

*"Разумееце, тры з паловай гады на пасадзе генеральнага пракурора — гэта добрая нагрузка*, — гаворыць Васілевіч. — *У прынцыпе, рашэнне было за кіраўніком дзяржавы..."* Ад больш шырокіх каментарыяў і падрабязнага аналізу сітуацыі, як кажуць, па гарачых слядах Рыгор Аляксеевіч пакуль устрымаўся.

## У чаканні вялікай кадравай чысткі

Прызначаючы новага генпракурора **Аляксандра Канюка**, Лукашэнка адразу адзначыў: *"У пракуратуры трэба прынцыпова разабрацца з сітуацыяй, перш за ўсё кадравай. Як чалавек ваенны вы па службе ведаеце многіх людзей, якіх можна было б прыцягнуць для працы ў Генеральнай пракуратуры і пракурорскіх органах, каб перш за ўсё там навесці парадак і павярнуць пракуратуру тварам да вырашэння тых праблем, якія трэба сёння вырашаць".*

Верагодна, у пракуратуру прыйдуць "маладыя ды жвавыя" — як, напрыклад, у Камітэт дзяржбяспекі, куды ўслед за кіраўніком **Вадзімам Зайцавым** прыйшло нямала памежнікаў. Ці будуць яны мець дачыненне да пракурорскай справы і хто пазбавіцца пасад у Генпракуратуры — пакажа час.

*"Якраз прафесіяналы Лукашэнку ў такіх ведамствах, як Генпракуратура, і не патрэбныя*, — выказвае сваё меркаванне былы суддзя, вядомы праваабаронца **Гары Паганяйла**. — *Яму патрэбны сляпыя выканаўцы яго палітычнай волі".*

Не выключана, што ў першую чаргу новы генпракурор падбярэ сабе аднаго-двух надзейных наместнікаў.

## Асабістая трагедыя

Аб новым генпракуроры вядома няшмат. Яму 51 год. У лютым гэтага года ён разам з міністрам унутраных спраў **Анатолем Куляшовым** атрымаў генеральскія пагоны. Аб ім у інтэрв'ю з цеплынёй адклікаўся старшыня Вярхоўнага суда **Валянцін Сукала**.

У 2004 годзе ў "Народнай Волі" была нататка пра **Аляксандра Канюка**, які тады ўзначальваў Мінскі міжгарнізонны ваенны суд.

*"З трагедыі пачаўся гэты год у сям'і старшыні Мінскага міжгарнізоннага ваеннага суда Аляксандра Канюка*, — паведамляла газета. — *3 студзеня яго 19-гадовы сын Уладзімір пайшоў з дому і не вярнуўся".*

Паводле паведамлення, прычынай стаў канфлікт з-за камп'ютара, за якім малады чалавек праводзіў занадта шмат часу. Бацька звярнуўся з заявай у міліцыю. Да пошукаў падключыліся і супрацоўнікі КДБ. *"А знайшоў мінчука — на жаль, без прыкмет жыцця — сельскі ўчастковы ў Дзяржынскім раёне,* — гаварылася ў паведамленні. — *Здарылася гэта 12 студзеня 2004 года... Па адной з версій, хлопец ехаў кудысьці на электрычцы, прапусціў свой прыпынак, выйшаў на наступным і вяртаўся пешшу. Відавочна, ён заблукаў, прыхінуўся да дрэва, заснуў і замёрз".* Канчатковыя высновы з гэтай гісторыі павінна была зрабіць пракуратура...

## Восьмы генпракурор не танкіст, а пехацінец

*За гады незалежнасці Беларусі змянілася восем генеральных пракурораў. Хто кіраваў Генпракуратурай?*

**Мікалай Ігнатовіч** — Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь у 1991—1992 гадах.

**Васіль Шаладонаў** — генпракурор са снежня 1992-га па 1995 год.

**Васіль Капітан** — у маі 1995 года прызначаны выконваючым абавязкі генеральнага пракурора, з 28 лютага 1996 года — Генпракурор Рэспублікі Беларусь. У снежні 1996 года сышоў у адстаўку.

**Алег Бажэлка** — 12 снежня 1996 года прызначаны генеральным пракурорам. 27 лістапада 2000 года вызвалены ад пасады. Прызначаўся прадстаўніком Рэспублікі Беларусь у Камісіі ААН па папярэджанні злачыннасці і крымінальным правасуддзі.

**Віктар Шэйман** — Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь у 2000—2004 гадах.

**Пётр Міклашэвіч** — прызначаны 29 лістапада 2004 года, вызвалены 8 лютага 2008 года.

**Рыгор Васілевіч** — прызначаны 8 лютага 2008 года, вызвалены 20 верасня 2011 года.



**Аляксандр Канюк** нарадзіўся 11 ліпеня 1960 года ў Гродне.

Пасля заканчэння Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў 1982 годзе па спецыяльнасці "правазнаўства" паступіў у распараджэнне камандзіра вайсковай часці ў Барысаве. Два гады быў камандзірам мотастралковага ўзвода 3-га гвардзейскага танкавага палка 3-й гвардзейскай танкавай дывізіі 7-й танкавай арміі Беларускай ваеннай акругі. Потым паступіў у распараджэнне Упраўлення ваенных трыбуналаў у Маскве. Год праходзіў службу на пасадзе судовага сакратара 26-га ваеннага трыбунала ў горадзе Ленінскае Кызыл-Ардзінскай вобласці ў Казахстане. Затым два гады служыў на пасадзе судовага сакратара, старэйшага судовага сакратара ў 167-м ваенным трыбунале Туркестанскай вайсковай акругі ў горадзе Кабуле ў Афганістане.

З 1987 года — член ваеннага трыбунала Мінскага гарнізона.

З 1993 года — суддзя Беларускага ваеннага суда.

З 1997 года — суддзя і старшыня Мінскага міжгарнізоннага ваеннага суда.

З 2006 года — суддзя і старшыня Беларускага ваеннага суда.

З 2009 года — намеснік старшыні, старшыня ваеннай калегіі Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь.

Дзяржаўныя ўзнагароды — ордэн "За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР" трэцяй ступені (1986 г.), 9 медалёў.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 3 чэрвеня 2008 года прысвоены першы кваліфікацыйны клас.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 22 лютага 2011 года №61 прысвоена воінскае званне генерал-маёра юстыцыі.

### ПЛАНЫ НА БУДУЧАЕ

## Дзе будзе працаваць Рыгор Васілевіч?

*"Мы яго будзем выкарыстоўваць альбо на навуковай працы, калі ён гэтага захоча (ён вельмі шмат працуе ў гэтым накірунку), альбо на выкладчыцкай, альбо на той і іншай, альбо на якой-небудзь дзяржаўнай службе,* — сказаў Лукашэнка. — *Гэта ўжо ён сам павінен вырашыць, і мы вызначымся, дзе ён будзе працаваць. У яго вельмі вялікі вопыт і вельмі вялікія веды як у юрыста. Я гэта вельмі цаню, і, вядома, ён з "абоймы" не выпадзе".*

**Рыгор Васілевіч** сказаў "Народнай Волі", што з будучым месцам працы ўжо вызначыўся.

*"Я працую на кафедры ў БДУ, працаваў там, яшчэ калі быў старшынёй Канстытуцыйнага суда, можа, буду і працягваць*, — гаворыць ён. — *У адпачынак не збіраюся — ад чаго адпачываць? А з будучай працай вызначыўся — выкладчыцкая праца вельмі цікавая".*

Дарэчы, ужо шмат гадоў Рыгор Васілевіч не толькі ўваходзіць у склад Вучонага савета юрыдычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта, але і падпрацоўвае ў Мінскім інстытуце кіравання.

### БЛІЦ-КАМЕНТАРЫЙ

**Гары ПАГАНЯЙЛА, старшыня юрыдычнай камісіі РПГА "Беларускі Хельсінкскі камітэт":**

— Прызначэнне Рыгора Васілевіча на пасаду генпракурора для многіх стала нечаканасцю, бо ён быў відавочна не пракурорскім чалавекам і не меў дастатковага досведу кіраўніцтва такім складаным апаратам, як Генпракуратура. Не выключана, што з-за нейкіх хібаў па кадравых і іншых пытаннях кіраўнік дзяржавы вырашыў замяніць яго. Але, з іншага боку, мы бачым кадравую палітыку Лукашэнкі: ён даволі часта мяняе кіраўнікоў ключавых ведамстваў, і пракуратура ў гэтым сэнсе не выключэнне.

У Лукашэнкі вельмі кароткая лава запасных, як кажуць трэнеры ў спорце. І ён тасуе гэтую калоду, сфарміраваную па прынцыпе асабістай адданасці і так і сяк. З іншага боку, ён не дае нікому доўга заседжвацца на такіх важных пасадах — каб засцерагчы сябе ад нейкіх негатыўных магчымасцяў змовы, змены ўлады і гэтак далей. Ён усё робіць для таго, каб трымаць кадры ў цвёрдым кулаку, і нікому не дазволіць паквапіцца на яго асабістыя прывілеі і ўладу...

**Алег ВОЛЧАК, былы следчы пракуратуры:**

— Васілевіч дазваляў сабе крытычныя выказванні ў адрас супрацоўнікаў міліцыі, напрыклад, калі яны ў цывільным затрымлівалі ўдзельнікаў маўклівых акцый пратэсту, — *цытуе праваабаронцу БелаПАН.* — Прызначэнне генпракурорам Канюка лічу не зусім удалым, так як ён прыйшоў на новую пасаду з суда, а ў пракуратуры — свая спецыфіка працы.

**Аляксандр ФЯДУТА, палітолаг, былы супрацоўнік Адміністрацыі прэзідэнта:**

— Пры генпракуроры Васілевічу была дадзена санкцыя на праслухоўку альтэрнатыўных штабоў у той момант, калі пачыналася перадвыбарная кампанія 2010 года, — *напісаў Фядута ў сваім інтэрнэт-дзённіку.* — Пры генпракуроры Васілевічу пракуратура працягвала даваць санкцыі на праслухоўку нават асоб, якія знаходзіліся ў камеры СІЗА КДБ. Гэтыя праслухоўкі павінны былі фігураваць на судзе як доказы вінаватасці падсудных. Пры гэтым калі мы з адвакатам паспрабавалі здабыць само абгрунтаванне, па якім пракуратура давала санкцыі на падобныя дзеянні спецслужбаў, наша просьба не была задаволена.

Пры генпракуроры Васілевічу хворых людзей працягвалі трымаць у СІЗА нават пасля таго, як ім быў зменены артыкул — з кваліфікацыі здзейсненага злачынства як асабліва цяжкага на менш цяжкае, прычым новы артыкул прадугледжваў магчымасць абрання іншай меры стрымання. Нагадаю, што ў дачыненні да **Зміцера Бандарэнкі**, нягледзячы на стан яго здароўя, падобную міласэрнасць пракуратура і не падумала праяўляць у прынцыпе.

Пры генпракуроры Васілевічу пракуратура запатрабавала, а суд даў неймаверна жорсткі прысуд інваліду **Дзмітрыю Уссу**.

Пры генпракуроры Васілевічу пракуратура не адхіліла ніводнай следчай справы (і нават тома) відавочнай палітычнай скіраванасці, прычым нават тыя, якія былі відавочна шытыя белымі ніткамі (напрыклад, утрымлівалі матэрыялы, атрыманыя незаконным шляхам — без прысутнасці адвакатаў), так што ў шэрагу выпадкаў ужо суддзі былі змушаны, спрабуючы (хоць колькі-небудзь) абараніць гонар сваёй мантыі, вычышчаць усё гэтае трызненне з канчатковых прысудаў.

Нарэшце, менавіта генпракурор Васілевіч публічна абяцаў, што доступ адвакатаў да абвінавачаных па справе 19 снежня будзе забяспечаны. Заяўляю: я меў зносіны без следчага са сваім адвакатам толькі ў першыя 15 хвілін перад першым допытам, калі ні мне, ні адвакату не была зразумелая нават сутнасць справы. Плюс яшчэ чатыры хвіліны, якія мне былі прадастаўлены следчым напярэдадні вочнай стаўкі з Вазняком — таму што інакш я абяцаў следчаму сарваць вочную стаўку. І ўсё. Пры гэтым мой ліст адвакату не быў накіраваны, а тэлеграма на імя адваката з просьбай аб прыходзе была адпраўлена, але адміністрацыя СІЗА "не змагла забяспечыць" маё канстытуцыйнае права на абарону...

**Марына КОКТЫШ.**

### ПАЛІТКУХНЯ

## Яраслаў Раманчук выходзіць з АГП

*Намеснік старшыні Аб'яднанай грамадзянскай партыі, былы кандыдат у прэзідэнты Беларусі на выбарах 2010 года Яраслаў Раманчук, напісаў заяву аб выхадзе з партыі.*

На першы погляд усё выглядае прыстойна. Раманчук патлумачыў свой крок жаданнем больш часу надаваць экспертнай працы, партыйны сайт паведаміў, што заява будзе разгледжана на пасяджэнні палітсавета і што папярэдне пройдуць нейкія кансультацыі з Раманчуком. Відавочна, што хлопцы спрабуюць захаваць твар у сітуацыі, калі захоўваць няма чаго.

Нагадаем, што пасля заяў Раманчука, зробленых падчас арышту членаў ягонага передвыбарнага штаба і іншых удзельнікаў прэзідэнцкай кампаніі, а таксама соцень простых людзей, якія вечарам 19 снежня выйшлі на вуліцы Мінска, некаторыя партыйцы прама патрабавалі выключэння Рманчука з партыі. Фактычна Раманчук яшчэ ў снежні стаў для многіх членаў АГП асобай, якой не падаюць руку, быў адхілены ад удзелу ў дзейнасці партыі і тым больш — ад кіраўніцтва ёю. Але з выключэннем Раманчука са сваіх шэрагаў у выніку вырашылі не спяшацца, дачакаўшыся вызвалення з-за кратаў кіраўніка АГП Анатоля Лябедзькі.

Лябедзька пасля выхаду з СІЗА КДБ доўгі час сцвярджаў, што яму патрэбна разабрацца ў сітуацыі і ніякай уцямнай пазіцыі наконт паводзін і заяў Раманчука не выказваў. Больш за тое, у старшыні партыі і былога намесніка, відаць, засталіся добрыя асабістыя адносіны, бо Лябедзька з сям'ёй прысутнічаў на вяселлі Раманчука ў якасці ганаровага госця. У шараговых членаў партыі гэта сітуацыя, калі ўсе робяць выгляд, што нічога не адбылося, выклікала абурэнне. Некаторыя нават заяўлялі, што гатовы выйсці з партыі, калі ў ёй застанецца Раманчук. Напэўна, тых, хто не дараваў Раманчуку здрады, аказалася нямала. Але сітуацыю вырашана разруліць ціха, без скандалаў, нібыта па згодзе бакоў.

**Ігар МАРОЗАЎ.**

### З-ЗА КРАТАЎ

## Алесь Бяляцкі дарэмна не губляе час...

Пару тыдняў таму з'явілася інфармацыя, што Алесь Бяляцкі, праваабаронца, які знаходзіцца за кратамі, не мае магчымасці ліставацца з паплечнікамі па грамадскай дзейнасці. Але зараз гэта ўжо не так. Сяброўка, журналіст Паліна Сцепаненка, у размове з карэспандэнтам "Народнай Волі" расказала: *"Лісты ад Алеся прыходзяць рэгулярна. Апошні я атрымала 13 верасня. Адразу агаваруся, што ў лістах няма і намёку на тое, як Алесь ставіцца да абвінавачання. Пра крымінальную справу ён не піша наогул. Па-першае, наўрад ці нешта б на гэты конт на волю выпусціла турэмная цэнзура, а па-другое, ведаючы Алеся, магу сказаць, што вінаватым ён сябе не прызнае. У асноўным Бяляцкі піша пра побытавыя рэчы за кратамі. Піша, што стасункі з сакамернікамі складваюцца нармальна, піша, што шмат чытае. Асабліва налягае на беларускіх класікаў. У адным з лістоў ён узгадаў, што ў Пішчалаўскім замку (сённяшняй "Валадарцы") сядзеў Якуб Колас, які працаваў тут над паэмай "Новая зямля". За кратамі Бяляцкі таксама стаў пісаць эсэ, мемуары пра аб'яднанне літаратараў "Тутэйшыя", кіраўніком якога ён у свой час быў. Бяляцкі ў курсе рэзанансу, які атрымала яго справа, бо атрымлівае газеты, у тым ліку і "Народную Волю". За кратамі Алесь вывучае англійскую мову, робіць фізічныя практыкаванні і чакае суда. Спадзяваннняў апынуцца на волі да судовага разбіральніцтва ў яго няшмат, і я адчуваю, што ён гатовы да любога развіцця падзей..."*

**Віталь ГАРБУЗАЎ.**

## Адзіны валютны курс не раней за кастрычнік

Другі тыдзень у Беларусі афіцыйна дзейнічаюць два курсы валют — камерцыйны і курс Нацбанка. Урад чакае, што адзіны раўнаважны курс беларускага рубля ўсталюецца толькі ў кастрычніку. Больш за тое — у 20-х чыслах месяца. Віцэ-прэм'ер **Сяргей РУМАС** растлумачыў чаму. "Гэта і падатковыя дні — да гэтых дат завяршаецца канверсацыя валюты "Белтрансгазам" для разліку за газ, — цытуе віцэ-прэм'ера БЕЛТА. — Такім чынам "Белтрансгаз" не страчвае на курсавых розніцах, атрымаўшы ад спажыўцоў сродкі па афіцыйным курсе і затым сканверсаваўшы іх па практычна такім жа курсе, а не па курсе другой сесіі".

## Колькі будзе каштаваць рубель?

Гэтае пытанне застаецца для беларусаў адным з самых актуальных. Як вядома, курс Нацбанка сёння 5400 рублёў за долар, у абменніках набыць долары можна па курсе плюс-мінус 8 тысяч рублёў.

*"Ніхто не дасць дакладнага значэння аб тым раўнаважным курсе, да якога мы ідзём, але адназначна можна сказаць, што ён знаходзіцца паміж сённяшнім афіцыйным і тым узроўнем, які склаўся на дадатковай сесіі валютна-фондавай біржы"*, — выказаў сваё меркаванне намеснік старшыні праўлення Нацбанка **Тарас НАДОЛЬНЫ**. Для выбудоўвання канкрэтных прагнозаў, на яго думку, спатрэбіцца яшчэ 2—3 тыдні.

## Нацбанк пракаментаваў павышэнне ставак па крэдытах на нерухомасць

Як вядома, "Беларусбанк" павышае працэнтную стаўку па новазаключаных крэдытных дамовах у беларускіх рублях на фінансаванне нерухомасці. Большасць чаргавікоў будуць браць пазыкі пад 31% гадавых, грамадзяне, што не церпяць нястачы, — пад 38%.

Аднак прадстаўнікі Нацбанка знайшлі ў гэтых шалёных стаўках плюсы. Але не для людзей, для — дзяржавы.

"Плюсаў ад высокіх працэнтных ставак значна больш з пункту гледжання макраэканомікі ў параўнанні з мінусамі для насельніцтва, калі скарачаюцца аб'ёмы жыллёвага і спажывецкага крэдытавання, — цытуе БЕЛТА намесніка старшыні праўлення Нацбанка **Тараса Надольнага**. — Але гэта, я мяркую, часовая сітуацыя, і па меры стабілізацыі, натуральна, мы прыйдзем да таго, каб зніжаць стаўку рэфінансавання і, як вынік, будуць зніжацца стаўкі па інструментах падтрымкі ліквіднасці для банкаўскай сістэмы і крэдытныя стаўкі для фізічных асоб. Але тут ва ўсім мусіць быць мера і асцярожнасць. Калі мы зробім грашова-крэдытную палітыку больш жорсткай, то выключэнняў не павінна быць ні для якіх сектараў эканомікі, таму што насамрэч менавіта цвёрдая грашова-крэдытная палітыка дазваляе сёння стабілізаваць сітуацыю".

## Не идет Россия — приходит Китай

*(Окончание. Начало на 1-й стр.)*

Если денежные власти продолжат политику дорогих денег в форме резкого повышения всех банковских процентов, то перед бизнесом может стать проблемой ее оборотная сторона: где взять деньги для поддержания нормального воспроизводства. Это еще больше замедлит темпы роста ВВП. Однако существенное ужесточение денежно-кредитной политики необходимо. Без нее не выйти из инфляционно-девальвационной спирали. Раскаленный печатный станок необходимо останавливать.

Несмотря на те миллиарды долларов, которые с большой вероятностью поступят в Беларусь извне до конца года, они не закроют ее потребностей. Среднемесячная потребность белорусской экономики — не менее 1 млрд долларов в месяц. Потребность страны во внешнем финансировании, по оценке МВФ, на текущий год составляет свыше 15 млрд долларов. Белорусское правительство уточнило сумму испрашиваемого у Фонда кредита в пределах 5—8 млрд долларов. Но нынешнее состояние экономики страны никак не удовлетворяет руководство МВФ, как, впрочем, и правительство России. Отметая всякие политические факторы задержки очередного кредитования, специалисты Фонда все время твердят о структурных реформах, которые почти не проводятся в Беларуси. Это выражение "структурные реформы" набило оскомину. Не претендуя на всю полноту вопроса, отметим, о чем идет речь с точки зрения того, что необходимо в экономике Беларуси срочно менять, от чего надо уходить.

Прежде всего та самая проклятая приватизация. В странах с рыночной экономикой соотношение государственного и частного сектора — 30% к 70%. В Беларуси — почти обратное. Акционерные общества, где контрольный пакет принадлежит государству, не могут относиться к частному сектору. Процесс постоянно тормозится. По крупным активам власти не находят общий знаменатель с потенциальными покупателями по цене и социальным условиям, на средние и мелкие активы — нет охотников. На сегодня приватизация становится главным источником поступления недостающей валюты.

Избыточная занятость в госсекторе, излишняя рабочая сила должна перетечь в частный сектор, который на сегодня имеет низкий уровень развития. Оцениваемый независимыми экспертами его вклад в ВВП — 10—12% (в развитых странах — 50—70%), а вклад в общую сумму собираемых налогов — 20%.

Непомерная налоговая нагрузка на предприятия, которая не дает возможность создать накопления на развитие производства. Особенно частному сектору. Сложная, громоздкая налоговая система.

Недостаток собственных источников для производственных инвестиций. Острый дефицит прямых иностранных инвестиций, непривлекательность для них белорусской модели экономики. Страновой риск. Государство может в любой момент изменить "правила игры", вмешаться в деятельность субъектов хозяйствования. Как резидентов, так и нерезидентов.

Отсюда повышенная материалоемкость, энергоемкость, импортоемкость устаревших технологий. Низкое качество продукции, барьеры на пути инноваций, низкая конкурентоспособность продукции. Низкая рентабельность предприятий, неудовлетворительное финансовое положение многих из них. Однобокий экспорт (нефтепродукты, калийные удобрения).

Применение директивных (обязательных для выполнения) показателей для субъектов хозяйствования, начиная с выпуска продукции и других. Причем практически применяются как для государственных, так и для частных предприятий, которые контролируются местными органами власти.

Правовая незащищенность индивидуальных предпринимателей, частных предприятий. Они работают в неравных условиях с государственными.

Иждивенческий, патроналистский характер белорусской экономики. Суть: забирать средства от эффективно работающих предприятий и передавать работающим неэффективно. Подавляет желание работать эффективно, а значит, и деловую инициативу.

Убыточное сельское хозяйство, основывающееся на коллективной собственности, которое содержит вся страна... Отсутствие свободного рынка земли.

Непомерные непроизводительные бюджетные расходы. Раздутые чиновничий и силовой аппараты.

Эмиссионное (не обеспеченное товарами и услугами) кредитование экономики со стороны Нацбанка. За 2010 год при росте ВВП на 7,6% требования банков к экономике увеличились (в основном выданные кредиты) на 40%. В текущем году скорее всего объемы кредитования ожидаются не меньшие. Одна из причин всплеска сегодняшней инфляции.

Разваленный валютный рынок. Множественность валютных курсов белорусского рубля. Административное распределение валюты.

Наконец, авторитарный характер белорусской экономики, где все важные и не очень решения принимает один человек. Это подавляет инициативу разумных специалистов, насаждает страх ответственности за свои действия. Эти решения зависят во многом от того, кто и как преподносит этому лицу требуемую информацию.

Остается вопрос: возможны ли в принципе давно назревшие структурные реформы в авторитарной экономике, если их принятие поменяет ее природу?

### СИТУАЦИЯ

## Почему «пролетела» Ермакова?

*В эти дни в Вашингтоне пройдет годовое собрание Всемирного банка и Международного валютного фонда. Пройдет без главы Национального банка Беларуси Надежды Ермаковой, которая должна была возглавить белорусскую делегацию, но не смогла вовремя получить американскую визу. В чем дело?*

— Отмена запланированного визита председателя правления Национального банка Беларуси Н.А.Ермаковой в Вашингтон для участия в ежегодном заседании советов управляющих Всемирного банка и Международного валютного фонда связана с медлительностью, проявленной при оформлении въездной визы внешнеполитическим ведомством США, — говорится в распространенном заявлении Управления информации Нацбанка Беларуси. — Несмотря на своевременное направление всех необходимых документов в Посольство США в Минске и информирование американской стороны о сроках предстоящего визита, виза на въезд в США Н.А.Ермаковой была выдана только 21 сентября — уже после отбытия остальной белорусской делегации рейсовым самолетом в Вашингтон. Надеемся, что возникшая ситуация никак не связана с желанием каким-либо образом воспрепятствовать участию высшего должностного лица Беларуси в мероприятиях, проводимых влиятельными международными организациями, и объясняется исключительно нерасторопностью отдельных офисных клерков.

На момент подписания номера в печать Посольство США в Беларуси ситуацию пока не прокомментировало.

**Алесь СВЕТЛАНИЧ.**

СИТУАЦИЯ

# Антонина Иванова против ЖРЭО

*Почти два года в квартире минчанки Антонины Ивановой идет ремонт. Жилищное ремонтно-эксплуатационное объединение Центрального района Минска не может устранить трещины в стенах и на потолке одной из комнат, которые достались владелице квартиры "в наследство" от недобросовестных рабочих, возводивших этот дом. Процесс не ускорило даже обращение хозяйки в Совет министров, где ее вопрос взяли на особый контроль.*

*От безысходности Антонина Петровна позвонила в "Народную Волю".*



"Пожалуйста, помогите, — рыдала она в телефонную трубку. — Если ваша газета не вмешается, не предаст гласности эту ситуацию, я, наверное, так и умру в грязи, пыли и со строительным материалом вместо мебели. Два года ЖРЭО не может закончить ремонт в моей квартире! Превратили мое жилище в стройку и не торопятся завершать работы. По телевизору показывают, как у нас в стране все службы четко работают, по одному звонку бегут устранять жалобу. А что на самом деле?! Два года по вине ЖРЭО я живу на стройке и на успокоительных таблетках!"

## Цена строительной ошибки

Квартира Антонины Ивановой расположена на последнем этаже 20-этажного дома по улице Леси Украинки. Это почти центр Минска. Район престижный. Заселялась сюда Антонина Петровна вместе с дочерью. Квартиру ей предоставил завод холодильников "Атлант", на котором на тот момент она проработала слесарем механосборочных работ более 10 лет. По сравнению с комнатой в общежитии двухкомнатное жилище показалось раем — комнаты хоть и небольшие, зато изолированные, плюс две лоджии, 9-метровая кухня, вид из окна замечательный — даже Минское море видно. Рядом поликлиника, гимназия и завод в двух шагах — на работу Антонина Петровна ходит пешком, что для столичной жизни просто непозволительная роскошь.

Новоселье Ивановы справили в июне 1998 года. Несмотря на то что дом был сдан в эксплуатацию в 1994 году, в этой квартире никто не жил. Ивановы стали ее первыми хозяевами. И прежде чем заселиться, Антонина Петровна вместе с председателем жилищной комиссии осмотрела свое будущее жилье. Тогда же были устранены недочеты: в квартире подключили сантехнику, установили электросчетчик, поклеили обои и т.д. В течение 10 лет Антонина Петровна возмещала заводу потраченные на ее квартиру деньги. В 2008-м квартира стала ее частной собственностью. Но хорошее, как говорится, быстро заканчивается.

*— По правде говоря, трещины на межкомнатных стенах были сразу, при заселении,* — вздыхает Антонина Петровна. *— Потом трещина от потолка до пола образовалась и на межквартирной стене. Я пыталась их прятать за мебель, обои, постоянно переклеивала то одну комнату, то другую, на серьезный ремонт денег не было, надо было рассчитываться с заводом за квартиру. В 2009 году, когда квартира уже была моей частной собственностью, а дочь оканчивала школу, я решила в ее комнате сделать ремонт. Думала, что с трещинами строители легко справятся — сейчас и материалы более современные, и мастера владеют новыми технологиями. Наняла по объявлению строительную бригаду, и к 31 августа 2009 года ремонт в комнате был закончен.*

Но через месяц, по словам Антонины Петровны, ей пришлось обратиться в местный ЖЭС, а потом ЖРЭО. И с тех пор началась ее борьба за законное право жить в нормальных условиях.

Дело в том, что в сентябре отремонтированные стены снова затрещали, на прежних местах проявились старые трещины. Знакомые подсказали: скорее всего брак был допущен еще при строительстве дома и его должны устранить те, у кого Иванова купила квартиру, т.е. государство.

